**Т. М. Пятроўская**
Гомельскі дзяржаўны педагагічны каледж імя Л. С. Выгоцкага

# ЛАБАРАТОРЫЯ “ЭКСПЕРТЫЗА ДЗІЦЯЧАЙ КНІГІ” ЯК АКТУАЛЬНАЯ ФОРМА РАБОТЫ ПРЫ ПАДРЫХТОЎЦЫ СУЧАСНАГА ПЕДАГОГА

Сучаснае пакаленне дзяцей (да іх ліку можна ўжо прылічыць і сучасных студэнтаў) – абсалютна ўнікальнае, перанасычанае інфармацыяй, гіперапекай і ўсемагчымымі развіццёвымі і забаўляльнымі цацкамі і гаджатамі. Менавіта таму прадстаўнікам старэйшага пакалення, якія выступаюць у ролі выкладчыкаў і настаўнікаў для гэтага пакалення, цяжка падабраць формы, прыёмы і метады, якія б адпавядалі запытам часу, тым больш што не так ужо і лёгка вызначыць, якія прафесіянальныя навыкі сапраўды будуць неабходнымі у будучым. Вельмі слушна на гэты конт выказалася футуролаг і палітолаг Кацярына Шульман: “Неўратычнае імкненне хутка-хутка напхаць у дзіцяці ўменні і навыкі з тым, каб яно было падрыхтавана да жыцця, змянілася адчуваннем, што нельга ў яго нічога інсталіраваць, таму што мы не ведаем, як зменіцца свет заўтра”[1]. Атрымоўваецца, што не так важна сёння забяспечыць вучня / навучэнца / студэнта ведамі, спецыфічнымі для пэўнай дысцыпліны навыкамі і ўменнямі, колькі развіваць агульныя здольнасці, якія дапамогуць лёгка манеўрыраваць ў інфармацыйнай прасторы. Так, напрыклад, ужо сёння ёсць сумненні ў засвойванні замежных моў, бо тэхнічныя прылады будучыні будуць дазваляць абыходзіцца без іх ведання. Розныя формы дыстанцыйнага навучання дазваляюць не спыняць сваё прафесійнае развіццё, а значыць, дыплом аб заканчэнні ВНУ не становіцца фінальнай кропкай прафесійнай адукацыі. Сёння спецыялісты вылучаюць чатыры віды кампетэнцый, якія будуць найбольш патрэбны ў будучыні: камунікацыя, кааперацыя, крэатыўнасць і крытычнае мысленне (чатыры “К”). Менавіта гэтыя якасці могуць забяспечыць паспяховасць у любой прафесійнай сферы, яны выступаюць як своеасаблівы шкілет, на які з цягам часу будуць назапашвацца веды, прычым назапашванне гэта будзе ісці у больш хуткім і інтэнсіўным тэмпе, чым зараз. Такой хуткасці таксама патрабуе час.

Мастацкая літаратура – даволі ўдалы матэрыял для фарміравання ўсіх гэтых якасцяў, таму важна падрыхтаваць будучага педагога правільна выкарыстоўваць гэты матэрыял. Для гэтага недастаткова засвоіць пэўныя методыкі, трэба стаць самім удзельнікам працэсу фарміравання крэатыўнана и крытычнага мыслення, камунікатыўных навыкаў і здольнасці да кааперацыі пры вывучэнні твораў мастацкай



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

літаратуры. Менавіта гэта стала прычынай для стварэння лабараторыі "Экспертыза дзіцячай кнігі" на базе дысцыпліны "Беларуская дзіцячая літаратура", мэтай якой з'яўляецца фарміраванне творчай асобы навучэнцаў, якія валодаюць навыкамі самастойнай вучэбна-даследчай работы з прымяненнем інфармацыйных тэхналогій, крытычнай ацэнкі дзіцячага твора. У якасці матэрыялу была выкарастана сучасная дзіцячая літаратура. Трэба адзначыць, што большая частка праграмы па дысцыпліне "Беларуская дзіцячая літаратура" адведзена класіцы, у той час як на паліцах у кнігарнях прадстаўлены кнігі, выдадзеныя адносна нядаўна, прычым на іх долю прыходзіцца вельмі маленькая частка перавыданняў класікаў. Зразумела, што азнаёміць навучэнца з усімі кніжнымі навінкамі немагчыма, ды і не мае ніякага сэнсу, аднак вельмі важна, каб будучы педагог быў здольны правільна ацаніць, наколькі тая ці іншая кніга падыходзіць для пэўнага ўзросту, адпавядае інтарэсам дзіцяці і г. д. Сама па сабе дзіцячая літаратура цесна звязана з псіхалогіяй і педагогікай, таму адна з задач лабараторыі з'яўляецца навучыць "бачыць" кнігу на перасячэнні розных навук, а гэта ў сваю чаргу вырашае шмат іншых задач: ад прымянення тэарэтычных ведаў па псіхалогіі і педагогіцы на практыцы да папулярызацыі сучасных беларускіх кніг для дзяцей. У накірункі дзейнасці лабараторыі ўваходзіць: удасканаленне педагагічнага майстэрства і прафесійнай кампетэнцыі педагогаў; пошук і сістэматызацыя перспектыўных ідэй, якія спрыяюць мадэрнізацыі зместу адукацыі і каштоўнасных арыентацый усіх удзельнікаў адукацыйнага працэсу; правядзенне ў адукацыйнай установе паседжанняў, прысвечаных абмеркаванню сучасных дзіцячых кніг; накапленне прагрэсіўнага педагагічнага вопыту; стварэнне сайта з мэтай папулярызацыі сучаснай дзіцячай кнігі, яго своечасовае абнаўленне.

Форма лабараторыі абрана для дадзенага праекта абаснавана. Згодна з Тлумачальным слоўнікам Дзмітрыева слова *лабараторыя* мае два значэнні: 1) гэта ўстанова, якая вядзе эксперыментальную навукова-даследчую работу… 2) гэта аддзел прадпрыемства, установы, які займаецца аналізам ці іспытам чаго-небудзь…[2, 543]. Такім чынам, лабараторыя заўсёды звязана з даследчай дзейнасцю і з аб'ектыўнай ацэнкай пэўных аб'ектаў, што і з'яўляецца асноўнымі задачамі лабараторыі "Экспертыза сучаснай кнігі".

У рабоце лабараторыі выкарыстоўваюцца наступныя формы:

– Параўнанне твораў адной тэматыкі, вызначэнне актуальнасці тэмы для сучасных дзяцей. Тэма, абраная для даследавання, абмяркоўваецца з пункту гледжання псіхалогіі і педагогікі. Напрыклад, у межах тэмы "Літаратура як тэрапія ў цяжкіх сямейных адносінах" абмяркоўваюцца погляды навукоўцаў на мэтазгоднасць выкарыстання

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

“дарослых” тэм (развод бацькоў, каханне, сэксуальная адукацыя) ў дзіцячым чытанні.

– Правядзенне сацыялагічных даследаванняў з мэтай высвятлення чытацкіх інтарэсаў сучасных дзяцей і іх бацькоў.

– Творчая прэзентацыя новых кніг для шырокага кола чытачоў.

– Напісанне анатацый да кніг для сайта лабараторыі.

– Фарміраванне банка ідэй па папулярызацыі сучаснай дзіцячай літаратуры.

– Мастацкі аналіз кніг дзіцячай літаратуры.

– Правядзенне паказальных заняткаў і ўрокаў з выкарыстаннем адзначаных кніг.

– Дыскусія.

Фінальным этапам кожнага паседжання з’яўляецца выбар кнігі, якая была больш станоўча прынята як самімі навучэнцамі, так і дзецьмі, і складанне банка ідэй па яе папулярызацыі. У выніку выбіраюцца лепшыя ідэі для рэалізацыі групамі навучэнцамі.

Для прыкладу дзейнасці лабараторыі, прыводзім прыкладны план яе правядзення, які патрабуе дэтальнай папярэдняй падрыхтоўкі.

*Тэма “Тэхнічны прагрэс у сучаснай дзіцячай літаратуры”. Літаратурны матэрыял: А. Бутэвіч “Прыгоды віруса Шкодзі”, В. Шчукін “Падказкі ў казках доктара Компі”, А. Марціновіч “Як кот з камп’ютарам пасябраваў”*

*1. Прадстаўленне аналізу анкетавання бацькоў на тэму “Увага! Дзеці за камп’ютарам”.*

*2. Прадстаўленне вынікаў гутаркі з дзецьмі на тэму “Мары і інтарэсы сучасных дзяцей”*

*2. Паведамленне “Камп’ютар у творах дзіцячай літаратуры: даніна часу ці неабходнасць” з улікам меркавання псіхолагаў і педагогаў. Дыскусія “Камп’ютар у жыцці дзяцей: колькі і калі?”*

*3. Аналіз кніг (уключае як непасрэдны літаратурны аналіз, так і вызначэнне выхаваўчых і развіццёвых задач твора).*

*4. Гутарка пра мову кніг і адпаведнасць яе узроставым адрасам твора.*

*5. Прэзентацыі занятка/урока з выкарыстаннем твора.*

*6. Абмеркаванне прадстаўленых анатацый да кніг і выбар лепшай для публікацыі на сайце лабараторыі.*

*7. Выбар “кнігі паседжання” (кожны выказвае аргументаванае меркаванне), складанне банка ідэй па яе папуляразыцыі і плана рэалізацыі, фарміравання творчых груп.*

Такім чынам, лабараторыя садзейнічае як фарміраванню важных для спецыяліста любога накірунку якасцяў (крытычнае мысленне,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

кааперацыя, крэатыўнасць, камунікацыя), так і вузкапрофільных уменняў і навыкаў, неабходных педагогу. Акрамя таго, лабараторыя “Экспертыза дзіцячай кнігі” садзейнічае і папулярызацыі сучаснай беларускай кнігі для дзяцей і ўвогуле беларускага слова.

## Спіс выкарыстанай літаратуры

1 Данилова, А. Современная молодежь – самое правильное из всех поколений, какие только можно себе представить: [интервью с Е. Шульман] / А. Данилова // Православный мир [Электронный ресурс]. – Режим доступа:– http://www.pravmir.ru/ekaterina-shulman-sovremennaya-molodezh-samoe-pravilnoe-iz-vseh-pokoleniy-kakie-tolko-mozhno-sebe-predstavit/Дата доступа: 13.12.2017.

2 Лаборатория // Толковый словарь русского языка / под редакцией В. Д. Дмитриева М.: Астрель: АСТ, 2003. — 1578 с. — (Словари Академии Российской).

ф. СКОРИНЫ